Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Маркаўская сярэдняя школа Маладзечанскага раёна
Мінскай вобласці”

Даведнік рэгіянальных экскурсійных маршрутаў

адукацыйнай накіраванасці

# “Шляхамі малой радзімы - шляхамі ведаў”



Чапцова Алеся,Скарынка Вікторыя
Вучаніцы 10 класа,
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Маркаўская сярэдняя школа
Маладзечанскага раёна”
80293912023

***Маркава***
***2021***

# ЗМЕСТ

**Гісторыя вёскі як адбітак гісторыі краіны**
**3**

**Урок гісторыі і біялогіі пад вяза**
**15**

**Знайсці незвычайнае ў звычайным, ці Хата як асабісты Космас чалавека**
**21**

**Схема турыстычных маршрутаў**
**31**

# Гісторыя вёскі як адбітак гісторыі краіны




Пачатак XV стагоддзя, а дакладней 1415 год – першае ўзгадванне мястэчка Маркава ў пісьмовых крыніцах таго часу. Яно ўзгадваецца як Вялікакняжацкае сяло і двор, які ўваходзіў у склад Вялікага Княства Літоўскага. Прыкладна ў гэты ж час у тагачасных пісьмовых крыніцах з'яўляецца і першае ўпамінанне пра Беніцу як сяло Маркаўскай воласці Віленскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. У гістарычным сэнсе Беніцы пашанцавала больш. Яна часцей узгадваецца ў гістарычных матэрыялах, ды і гісторыя значна багацейшая. І ў нашы дні вандроўнікі едуць з Мінска і іншых, нават замежных мясцін, падзівіцца на беніцкі касцёл Святой Троіцы, транзітам праязджаючы праз Маркава. Ці заўсёды так было?




З боку Мінска трапіць у Беніцу можна толькі праз Маркава (калі не рабіць вялікі круг праз сучасныя Заскавічы). Пачынаючы з XIV стагоддзя (1323 год), пасля перанясення Гедымінам сталіцы княства з

Наваградка ў Вільню, адзін з важных гандлёвых шляхоў, а пазней і паштовы шлях, з Менска, Лагойска ў напрамку Крэва, Вільні, Трокаў (Тракая) якраз стаў пралягаць праз Радашковічы, Лебедзева, Маркава, Беніцу, Смаргонь, Ашмяны. Гэты Старавіленскі шлях даў штуршок для развіцця і нашай мясцовасці.




Князі на шляху да Вільні былі частымі гасцямі і ў Маркаве. З гістарычных крыніц вядома, што ў лютым 1495 года Маркава праездам з Масквы ў Вільню наведала вялікая княжна Алена – дачка Іаана ІІІ Маскоўскага. Алена ехала да свайго жаніха Вялікага князя літоўскага Аляксандра Казіміравіча. Маркава ў той час належала Аляксандру, і мясцовая знаць адпаведным чынам сустракала княжну.

Яшчэ адно паданне, звязанае з імем Алены Іванаўны, існуе ў Маркаве, а дакладней, нават і не паданне, а жывы сведак тых падзей. Кажуць, што на памяць аб цёплай сустрэчы Алена пажадала пасадзіць дуб. Безумоўна, сама яна не магла гэтага зрабіць, паколькі адбывалася сустрэча зімой. А вось тое, што дуб быў пасаджаны і расце на месцы, дзе ступалі ногі Алены, -



праўда.

Уладарамі Маркава ў розныя часы яго гісторыі былі Нарушэвічы, Мышкевічы, Храбтовічы, Забярэзінскія, Радзівілы, Сапегі, Нарбут, Пацы, Коцелы, Агінскія… Асобную старонку ў летапіс Маркаўскага староства ўнеслі прадстаўнікі шляхецкага роду Коцелаў. Гэты род валодаў Маркавам 129 гадоў (1683- 1812 г.г.).

Мяняліся ўладары і дзяржавы, у склад якіх уваходзіла Маркава, а жыццё працягвалася.

Самы буйны рост і развіццё Маркава зведала пасля 1861 года. У мястэчку тады налічвалася 45 двароў, у якіх жыло 369 жыхароў. А праз 36 гадоў, згодна з перапісам 1897 года, у мястэчку Маркава Вілейскага павета Віленскай губерні ўжо 122 двары, у якіх жыве 765 жыхароў.

У 1911 годзе ў лесе паміж Маркавам і Беніцай, налева ад брукаванкі, на плошчы 60 гектараў стараннямі Баляслава Свентаржэцкага, уладальніка сядзібы ў Маліноўшчыне, быў закладзены звярынец. За яго агароджай жылі серны, фазаны, лані, канадскія індыкі, качкі, рабчыкі, цецерукі. Вадзіліся ў звярынцы і рысі. Да нашага часу тая мясцовасць завецца Звярынец. Зараз жывуць там бадай толькі лісы з зайцамі, але славіцца ў нашы дні як грыбное месца.

Падчас першай сусветнай вайны каля Маркава ў бок Беніцы стаяла расійская вайсковая часць. Мясцовасць больш за два гады заставалася прыфрантвой (30 вёрст да лініі фронту) паласой. Маркаўцы ў чарговы раз у сваёй гісторыі зведалі цяжкасці такога жыцця. Гаспадаркі бесперапынна падвяргаліся рэквізіцыям. Забіралі хлеб, фураж, жывёлу, прадукты харчавання, падводы. Да акопных работ прыцягваліся дзеці, падлеткі, жанчыны, старыя людзі, бежанцы. Насельніцтва ратавалася як магло,

каб не стаць ахвярай куль ці газавых атак. Мястэчка амярцвела на некалькі гадоў.

Цяпер у аграгарадку Маркава (сучасная назва мястэчка) закладзены памятны знак, прысвечаны Першай сусветнай вайне. Падзею прымеркавалі да векавога юбілею заканчэння ваеннага канфлікту. Думаецца, што новы аб’ект паспрыяе прыцягненню дадатковай колькасці турыстаў, у тым ліку і замежных.

Пасля рэвалюцыі 1917 года ў Маркава сталі вяртацца яго жыхары – хто з фронту, хто з эвакуацыі. У канцы 1917 года ў Маркаве быў арганізаваны камітэт беднаты. Члены камітэта праводзілі ў Маркаве і навакольных вёсках сходы, мітынгі сялян. Работу праводзілі ва ўмовах падполля. На пачатку вясны 1918 года прыйшлі “першыя немцы”. Змены ўлады сталі адбывацца з падазронай хуткасцю. Немцы, затым на кароткі час – савецкая ўлада. За савецкай уладай – палякі. У 1919 годзе маркаўскія сяляне пішуць пісьмо аб падтрымцы савецкай улады. Пісьмо было надрукавана ў газеце “Бядняк”, а ў 80-х гадах мінулага стагоддзя на будынку



сельскага савета з’явілася мемарыяльная дошка з тэкстам таго самага пісьма. У 1921 годзе ў Маркаве ўжо 148 двароў і 847 жыхароў. У нацыянальным архіве адзначана, што ў лютым 1921 года ў Маркаве існавала беларуская школа, дзе навучаліся 132 вучні.




Міжваенны час маркаўцы пераадолелі ў складзе Віленскага ваяводства Маладзечанскага павета Другой Польскай Рэспублікі. У Маркаве ў маёнтку стаў жыць пан Страшынскі. Цяпер на месцы маёнтка знаходзіцца сортавыпрабавальная станцыя. Мястэчка развівалася. Працавала пачатковая школа з польскай мовай навучання. Далейшае навучанне адбывалася ў Беніцы. У 1939 годзе ў Маркаве ўжо налічвалася 160 двароў і 908 жыхароў.

1 верасня 1939 года пачалася Другая сусветная вайна. Некаторых мужчын паспелі мабілізаваць у Войска Польскае. 17 верасня 1939 года праз Маркава зноў прайшлі войскі – Чырвонай арміі. Палякі не маглі доўга супраціўляцца і па загадзе свайго камандавання здаліся. Цэнтральная вуліца аг.Маркава зараз носіць назву 17 верасня.

Пачатак вайны быў страшным, мястэчка бамбілі. Гарэлі дамы. Першая хваля наступлення хутка пайшла ў бок Мінска, і ў далейшым  праз Маркава пастаянна праязджалі калоны машын з вайскоўцамі. Ішло і шмат абозаў, але асабліва не прыпыняліся і не затрымліваліся. У 1942 годзе ў Маркаве на пастой з фронту з’явіліся немцы. Ёсць звесткі і аб арганізацыі немцамі  ў Маркаве яўрэйскага гета, якое было спалена ў 1943 годзе. За гады вайны было спалена 72 будынкі, у тым ліку спалены будынак народнага вучылішча, 48 жыхароў загінулі на фронце, дваіх забралі на прымусовыя работы. Вызваленне прыйшло ў 1944 годзе.




У 1949 годзе быў створаны першы калгас, які існуе і да дня сённяшняга.   Згодна са статыстычнымі дадзенымі ў 1969 годзе ў Маркаве мелася 285 двароў і жыло 865 жыхароў.

Вядомы даследчык гісторыі Маладзечанскага краю Г.А.Каханоўскі ў кнізе “Повязь часоў”, выдадзенай у 1985 годзе, так пісаў пра Маркава: “Жывуць тут звыш

800 чалавек, у школе 250 вучняў. У 2000 годзе ў вёсцы будуць жыць 1,5 тысячы чалавек. Вёскай тады Маркава ўжо і назваць няёмка будзе. Побач са школай хутка з'явіцца дзіцячы дашкольны камбінат на 120 месц. Усе ўмовы будуць там для дзяцей". Не ўсё з гэтага прароцтва спраўдзілася. Дзіцячы садок пабудавалі, наведваюць яго толькі 26 хлопчыкаў і дзяўчынак. Колькасць вучняў у школе скарацілася да 90, а вось Маркава цяпер называецца не вёска, а аграгарадок, хоць і пражывае там усяго толькі каля 650 чалавек. Нешта не так пайшло ў нашай сучаснай гісторыі, што не стала затрымлівацца моладзь на малой радзіме. Як вядома, гісторыя развіваецца па спіралі, можа, на наступным вітку вернецца бурлівае жыццё і ў Маркава, калі мы будзем не проста чакаць склаўшы рукі, а кожны на сваім месцы прыкладаць для гэтага намаганні, мы ж з Маркава.

А як жа жылі людзі, што рабілі, як адпачывалі?

Гістарычны цэнтр мястэчка спакон вякоў называўся ў Маркаве рынкам. Старажылы маркаўскія і да гэтага часу ўжываюць назву "рынак", калі хочуць сказаць, што падзея адбывалася ў цэнтры вёскі. Розныя існуюць дадзеныя аб тым, з якога часу ў Маркаве сталі праводзіць два разы ў год кірмашы-фэсты, але ўсе даследчыкі адзіныя ў меркаванні аб датах правядзення: на Міколу летняга (22 мая Цудатворца Мікалай) і 28 жніўня (Успенне Багародзіцы).

На першы дзень Вялікадня збіраліся ўсёй вёскай каля царквы і вадзілі Луку – адмысловы карагод, які водзяць толькі ў Маркаве. Намаганнямі



мясцовага святара протаіерэя Мікалая традыцыя ваджэння карагода адноўлена.

Ва ўсе гады існавання паселішча жывой крыніцай, святлом на небасхіле жыцця была і застаецца для людзей царква.



Царква Святой Тройцы была пабудавана ў 1860 годзе з натуральнага каменя на невялікім узвышшы недалёка ад цэнтра вёскі Маркава. Паводле гістарычных крыніц вядома, што першы праваслаўны храм у Маркаве з’явіўся ў пачатку XVII стагоддзя. Аднак не адно пакаленне даследчыкаў, ды і жыхароў вёскі лічаць, што храм у Маркаве быў значна раней, калі яго наведвала вялікая княжна Алена Іванаўна. Адрозніваючыся набожнасцю, яна наведвала

паселішчы, у якіх альбо былі цэрквы, альбо дзякуючы яе шчодрым ахвяраванням адраджаліся. На працягу некалькіх стагоддзяў храмы ў Маркаве будавалі драўляныя, а дрэва, як вядома, матэрыял недаўгавечны, таму з цягам часу прыходзілася рамантаваць, а калі рамонт не дапамагаў – будаваць новы храм. Апошняя драўляная царква была пабудавана ў 1831 годзе. Будаваліся ў мястэчку і храмы іншых канфесій: уніяцкія, каталіцкія. Касцёл быў пабудаваны ў 1740 годзе на сродкі пана старасты Яна Шчыта, каштыляна інфлянскага, і яго жонкі



Барбары, і асвечаны ў гонар Архангела Міхаіла. Царква і капліца ў вёсцы Маркава на сённяшні дзень знаходзяцца ў выдатным стане і з'яўляюцца цікавымі архітэктурнымі помнікамі і славутасцямі Беларусі. Не

меншай славутасцю з’яўляюцца званы на званніцы храма, на якой знаходзяцца пяць званоў вагой ад трынаццаці фунтаў да трынаццаці пудоў. На адным са званоў маецца надпіс: “Звон пожертвован в Марковскую церковь в 1636 году королем Польским и Великим Литовским Владисловом IV”. Астатнія званы адліты ў Маскве на заводзе Дзмітрыя Самгіна і ахвяраваны ў храм імператрыцай Кацярынай. Згодна з легендай, імператрыца была праездам у нашых мясцінах і ёй спадабалася месца, на якім размяшчаўся храм. Яна пажадала, каб з пагорка, на якім размяшчаўся храм, гучалі званы. І яны гучаць. З XVI стагоддзя перадаюцца ў Маркаве мясцовыя матывы. Званы Маркаўскай царквы, разам са званамі іншых 24 храмаў Беларусі, прэтэндуюць на ўключэнне ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Пра маркаўскі звон ведаюць далёка за межамі вёскі. Некаторыя людзі прыязджаюць спецыяльна паслухаць звон, асабліва на Вялікдзень.

Дабрабыт любога грамадства і яго росквіт у многім залежыць ад моладзі. Маладыя людзі займаюцца навукай, творчасцю, спортам, дабрачыннасцю. Гэтым мы робім унёсак у сацыяльна-эканамічнае развіццё сваёй мясцовасці. А ведаць падзеі мінулага – пачэсны абавязак кожнага чалавека.

Павандраваўшы па Маркаве, мы зноў стаім на Рыначнай пошчы, а пад нашымі нагамі закрытая пластам сучаснага асфальту ляжыць славутая дарога –

Старавіленскі шлях. Дарога гэта ва ўсе часы густа ўшчыльнялася слядамі падзей. Яна вядома помнікамі, а таксама барацьбітамі і змагарамі за сацыяльную і нацыянальную незалежнасць народа. Аб’яднаўшы багатую гісторыю вёскі Маркава, самабытнасць традыцый яе жыхароў, павандраваўшы па маркаўскіх ваколіцах, разумееш, што гісторыя краіны складаецца з гісторый населеных пунктаў і людзей, якія насялялі і насяляюць гэту зямельку.

# Урок гісторыі і біялогіі пад вязам

У Верхніх Талуях ля Маркава сціпла расце адно з самых старых дрэў нашай краіны -- вяз.

Гэта некаранаваны чэмпіён сярод вязаў-патрыярхаў на прасторы СНД. Сярод вязаў, зарэгістраваных у нашых суседзяў, – у Расіі, Украіне, Латвіі, Літве, – такога вялізнага няма. У Беларусі наогул з зарэгістраваных і запаведных векавых дрэў, якія ахоўваюцца законам як помнікі прыроды, няма ніводнага вяза.

Па звестках з розных крыніц - памеры вяза з Верхніх Талуёў уражваюць. Абхват ствала амаль сем метраў (на вышыні 1,3 метра – 697 см). Дыяметр – 222 см. Дзевяць галін адыходзяць ад ствала на ўзроўні ад 2 да 2,5 метраў. Шляхам праведзеных вымярэнняў у нас таўшчыня вяза атрымалася роўнай 784 см.



Вышыня дрэва больш за 25 метраў. Узрост яго больш за 400 год, а можа нават і 600. Пры добрых умовах вязы жывуць у сярэднім да 400 гадоў і маюць абхват да шасці метраў. У ствале маецца вялікае дупло, якое на цяперашні час амаль поўнасцю зацягнулася. Жыхарка вёскі Ірына Вікенцьеўна Дурэйка,



насупраць чыёй хаты расце славуты вяз, узгадвае, што гадоў сорак таму дупло было любімым месцам для хованак мясцовай



дзетвары, паколькі ў яго лёгка мог залезці нават дарослы чалавек.

Самы вялікі вяз у абхваце 4,7 метраў і вышынёй 30 метраў расце ў Расіі, у Ленінградскай вобласці. Самы

вялікі вяз на Украіне мае абхват 5,2 метраў, расце ў Сумскай вобласці.

Самы стары вяз Францыі быў пасаджаны ў 1350 годзе, ссох у 2010 годзе, а самы стары вяз Грэцыі быў пасаджаны ў 1286 годзе і рос да нядаўняга часу.

Наш вяз, верагодна, старэйшы за адзін з самых вялікіх і старых англійскіх вязаў, які меў абхват 6,6 метра. Для брытанцаў вяз з'яўляецца святым дрэвам, татэмам, як для беларусаў груша ды дуб, якія нельга сячы і паліць.

Самы стары вяз Італіі меў абхват 6,3 метраў і ўзрост больш за 400 гадоў. Ён таксама саступае нашаму вязу ля Маркава.

Толькі ў Польшчы, у Камарове, расце вяз яшчэ большых памераў у абхваце.

**Дзе вырас вяз**

З'явілася гэта дрэўца ў ВКЛ, у Віленскім ваяводстве, ля Маркава, у вёсцы Талуі. Талуі ўпершыню ў пісьмовых крыніцах упамінаюцца ў 1616 годзе, калі вяз быў ужо досыць вялікі. Ёсць Талуі Верхнія, дзе цяпер на двух пляцах уздоўж дарогі да лесу знаходзіцца 9 хат (некалі налічвалася 15); Талуі сярэднія – гэта хутары, размешчаныя на схіле пагорка, у якіх засталіся тры хаты; і самая вялікая частка – Талуі Ніжнія, дзе ля падножжа гары, ля рачулкі Гадзяя, цяпер налічваецца больш за два дзясяткі хат.

Афіцыйна ў Талуях налічваецца 16 гаспадарак і 22 жыхары, астатнія дачнікі.

Калі ўявіць, што нашаму вязу ля Маркава 600 гадоў, то гэта значыць, што паўтара стагоддзя ён рос у Вялікім Княстве Літоўскім, больш за два стагоддзі, з 1569 па 1795 год, – у складзе Рэчы Паспалітай. Трохі пабыў пад шведамі. У студзені 1793 Маркава ўвайшло ў склад Расійскай імперыі, а Талуі засталіся ў Ашмянскім павеце Вялікага Княства Літоўскага.

Мяжа пралягла зусім побач, але магутны вяз лёгка і шчодра перакідваў свае "крылатыя арэшкі" ва ўсе напрамкі. Для яго мяжа нічога не вырашала, а толькі вольны вецер і птушкі, якія рассейвалі насенне, каб узышлі ў акрузе маладзенькія дрэўцы. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай вяз апынуўся ў Расіі, каля двух стагоддзяў пражыўшы ў складзе імперыі. Трохі за гэты час пабыў пад французам. Потым, у 20 стагоддзі, пачаліся самыя крутыя павароты гісторыі – Першая сусветная вайна, рэвалюцыя, акупацыя Кайзераўскай Германіяй, узнікненне БНР, ЛітБел, пасля польская акупацыя, вяртанне ў Савецкую Беларусь, другая Рэч Паспалітая, зноў першыя Саветы Беларусі ў складе СССР, фашысцкая акупацыя, вызваленне.

Зноў у СССР, і нарэшце – суверэнная Беларусь. Атрымалася вельмі стракатая палітра і цікавая гістарычная гірлянда сцягаў і гербаў уладальнікаў

тутэйшай  зямлі, дзе рос і  расце наш верхнеталуёўскі вяз ля Маркава.

Стаіць патрыярх у пагорыстай мясцовасці, якая надае пейзажу пэўную  маляўнічасць,  робячы яе так званай беларускай Швейцарыяй. Асабліва прыгожая гэтая мясцовасць была крыху раней, але і цяпер кожны можа хоць на хвілінку ўявіць сабе гэтыя горы, пакрытыя векавым гаем, дзе расла да неба знакамітая Маркаўская пушча.



Тутэйшы жыхар Іван Дурэйка ўспамінае ,што ў дзяцінстве яны з хлапчукамі  да ствала вяза  прыбілі адзін над адным некалькі  аполкаў, якія выкарыстоўвалі  як драбіну, каб залезці ў “штаб” і далей, на самы верх дрэва. Зверху, у першыя асеннія маразы, калі паветра  асабліва чыстае і празрыстае, адкрываюцца дзівосныя  далягляды. Адразу, нават без бінокля, бачныя тры гарады – Маладзечна, Вілейка,

Смаргонь, а таксама некалькі мястэчак – Маркава, Лебедзева, Беніца, Залессе, Заскавічы, Турэц-Баяры, Пруды.




Наш "герой" стаіць на беразе сажалкі. Іван Міхайлавіч ўспамінае, што пасля вайны ў сажалцы лавілі карасёў бучамі і кашамі, сплеценымі з тонкіх галін гэтага ж вяза, бо яны не гніюць у вадзе.

Дзякуючы намаганням Маладзечанскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы акружаючага асяроддзя ўнікальны вяз у вёсцы Талуі Маладзечанскага раёна ўзяты пад ахову. Каштоўнасць вяза як прыроднага аб'екта ацэняць спецыялісты Акадэміі навук Беларусі. Рашэнне аб прыданні дрэву статуса помніка прыроды мясцовага значэння прыняў райвыканкам – на карце раёна з'явілася яшча адна славутасць.

# Знайсці незвычайнае ў звычайным, ці Хата як асабісты Космас чалавека

Імклівая рака нашага жыцця мае свой гістарычны выток. Усе памкненні і намаганні сучаснікаў звернуты ў будучыню, але мы не можам не думаць аб мінулым, бо яно – аснова нашага сёння і нашай будучыні. І гэта такая неабходнасць і такая натуральная повязь часоў ніколі не павінна ні слабець, ні,тым больш, губляцца.

Ёсць людзі, месцы, падзеі, здольныя паўплываць на наша жыццё: змяніць светабачанне, падкарэктаваць арыенціры і зрабіць пераацэнку жыццёвых каштоўнасцяў. Калі мы хочам паўней адкрыць для сябе наша мінулае, глыбей зразумець яго і ў пэўным сэнсе перажыць самому – падарожнічайце. Можна пачаць са свайго населенага пункта, са сваёй малой радзімы.

Кожны дзень, ідучы на працу ці заняткі, мы абмінаем унікальныя помнікі культуры, архітэктуры, прыроды і нават не здагадваемся пра гэта. У кожнага з нас ёсць магчымасць па-іншаму зірнуць на штодзённыя рэчы і перамяніць сваё стаўленне да спадчыны. Падчас вандровак неабходна звяртаць увагу не толькі на велічныя замкі і манументальныя палацы, але і на дарагія сэрцу невялікія дамкі, заняпалыя сядзібы – усё, што стварае непаўторнасць роднага краю. Непаўторнасцю нашага краю з'яўляецца і наша мова, песні, танцы, традыцыйныя

(для кожнай мясцовасці свае) рамёствы, абрады, жылыя і гаспадарчыя побудовы, прылады працы, посуд і шмат што іншае.

Не баючыся перабольшаць, патрэбна сказаць, што ў жыцці чалавека ёсць тры рэчы, па якіх можна вельмі дакладна вызначыць яго этнічную прыналежнасць: гэта размоўная мова, святочнае адзенне і традыцыйнае жыллё. Жыллё чалавека на працягу гісторыі змянялася і ўдасканальвалася. Сучаснаму чалавеку, узброенаму складанейшымі навігацыйнымі прыборамі, якія ў любы час і ў любым месцы зямнога шара памогуць вызначыць дакладнае месцазнаходжанне, цяжка паверыць, што яго далёкія продкі, не маючы такой апаратуры, цудоўна разбіраліся ў законах сусвету і імкнуліся жыць у згодзе з ім. Са шматлікіх казак, паданняў, прадказанняў нашы продкі добра ведалі, што не ўсякая тэрыторыя зямлі аднолькава адносіцца да чалавека. На адным месцы – на ўзвышшы, як мага бліжэй да сонца, – людзі ўзводзілі культавыя пабудовы. У пэўных месцах ставілі кузні, а, як казалі, па суседству з нячыстай сілай будавалі млын. У адным месцы вадзілі вясеннія карагоды, а ў другім – хавалі суродзічаў.

Лічылася, што правільна выбранае месца для будаўніцтва дома забяспечыць яго гаспадарам шчаслівы лёс і сямейны дабрабыт. Добрым месцам лічылася тое, дзе збіраліся куры ды гусі, дзе апоўдні адпачывала хатняя жывёла. З пакалення ў пакаленне

перадаваліся, асабліва па мужчынскай лініі, звесткі аб тым, дзе нельга будаваць хату, з якога дрэва будаваць. У народнай культуры склалася цэлая сістэма ўяўленняў аб свеце раслін.Чалавек "не сябраваў" з дрэвам, якое карысталася дурной славай. Да такіх дрэў, ва ўяўленні нашых продкаў, адносіліся асіна і елка. З іх хаты не будавалі. А вось сасна лічыцца дрэвам са станоўчай энергетыкай, таму і была найбольш прыдатным матэрыялам для ўзвядзення хат. **Калі ж рабілі нарыхтоўку будматэрыялаў**? Найбольш прыдатнымі для нарыхтоўкі драўніны на будаўнічыя патрэбы лічыўся час канца зімы і пачатка вясны. Гэта акалічнасць нават захавалася ў старажытнаславянскіх назвах месяцаў: люты – "сечань", можна секчы, рэзаць лес, а сакавік – "сухі", што азначала, што зрэзанае дрэва падсохла і яго можна вывозіць з лесу да месца будучай будоўлі. **Калі пачынаць будоўлю?** У большасці рэгіёнаў Беларусі прытрымліваліся правіла: "Без Тройцы дом не будуецца". Таму найбольш падыходзячым часам для пачатку будоўлі быў час паміж Радуніцай і Тройцай. **Як будавалі?** Калі ўважліва прыгледзецца да сістэмы забудовы населеных пунктаў беларусаў, то вельмі яскрава бачна, што яны гарманічна ўпісваюцца ў мясцовы ланшафт. Вызначальнымі фактарамі маглі быць берагі рэк, вадаёмы, пагоркі, лагчыны (в.Доўгі Лог), лес альбо гай (в.Гаеўцы) і г.д. Вёскаўтваральным элементам для Маркава стала славутая дарога

Віленскі шлях, якая пралягала ў накірунку з усходу на захад, і р.Гадзяя з поўдня на поўнач. У выніку атрымаўся своеасаблівы крыж. Галоўная вуліца ў паселішчах (калі дазвалялі прыродныя ўмовы) была скіравана з усходу на захад. Дамы, як правіла, ставіліся пердыпекулярна вуліцы, указваючы сваімі “глухімі” сценамі на поўнач ці ўсход, а вокнамі – на поўдзень і захад. Найбольш распаўсюджаны тып будынка, пры якім на вуліцу выходзяць два акны, а ў сцяне, размешчанай абапал падворка, мае два, а часцей і тры акны. Дзверы павінны быць на ўсход і ў двор. Што з гаспадарчых пабудоў было ў двары? Хлеў, свіран, гумно, павеці, куратнік, стопка. Большасць з гэтых пабудоў маглі стаяць у адзін рад з хатай, а маглі і асобна.









На старых вуліцах Маркава яшчэ дзе-нідзе захаваліся сялянскія падворкі самага пачатку мінулага стагоддзя, а таксама даваеннага часу. Сапраўдным рарытэтам з’яўляецца былы дом парабка, які пабудаваны ў 1912 годзе. Жылыя памяшканні, халодныя сені і стопка – усё пад адной страхой. Першапачаткова гаспадарчых пабудоў побач з хатай не было, бо жылі там тыя, хто працаваў на мясцовых паноў і асабістай гаспадаркі не меў. У некалькіх дзясятках



метраў ад пабудовы да пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя знаходзіўся вадзяны млын.

Па хаце, гаспадарчых пабудовах, падворку і па тым, што на падворку і ў хаце, заўсёды можна было зрабіць выснову аб заможнасці гаспадароў, аб колькасці дзяцей у сям’і і шмат чым іншым. Ёсць у Маркаве некалькі дамоў, якія карэнным чынам адрозніваюцца ад усёй астатняй пабудовы – яны глінабітныя. Час робіць сваю справу: два з іх амаль разваліліся, а вось трэцяму пашанцавала – дбайныя гаспадары “абшылі” хату сучаснымі будаўнічымі матэрыяламі, і дом стаіць як новы, але ўжо не прыцягвае сваёй непаўторнасцю, бо дамоў з сайдынгу – дзясяткі, а вось з гліны два.





Дарэчы, а ці заўважалі вы такую акалічнасць, што калі вы пэўны час не былі ў нейкай вёсачцы ці нават на вуліцы ў населеным пункце, то некаторыя пабудовы можаце і не пазнаць? Так было і са мной. Самыя старыя хаты знаходзяцца на вуліцы Кастрычніцкай (Кавальсай у

часы майго дзяцінства). Дык вось калісьці я беспамылкова магла назваць прозвішчы гаспадароў кожнага з іх. А зараз і гаспадароў тых няма, і



хаты “асучасніліся” пад спрытнымі ды ўмелымі рукамі дачнікаў ці дзяцей тых самых гаспадароў, якія выкарыстоўваюць радавыя гнёзды як лецішчы. А часам, набыўшы старэнькі дамок, яго і ўвогуле зносяць, каб на расчышчаным месцы пабудаваць новы. Вось такі лёс чакае і гэты самы маленькі на вуліцы дамок. А колькі гаспадарскага дабра, якое аказалася нікому не патрэбным, закопваецца ці выкідваецца як смецце: драўляныя ложкі, канапы, скрыні, шафы, якія даваліся бабулям у пасаг, посцілкі, абрусы, вышыванкі.

Каб на свае вочы пабачыць, што было ў сялянскай хаце, “заглянем у хату”, а дакладней, у музейны пакой, які створаны ў памяшканні



Маркаўскага дома культуры. Першае, куды мы трапляем у старой сялянскай хаце, да якой яшчэ не дайшлі “ачумелыя ручкі” сучасных дызайнераў – сені. Сені цёмныя, замест акон можа быць маленькае акенца. Дзверы нізкія, каб зайсці ў хату, патрэбна “пакланіцца”ёй. Каб зайсці ў пакой, вам неабходна павярнуць направа, а вось калі зблытацца і пайсці налева, то трапіце ў стопку. У пярэднім пакоі стаяла печ. Печ заўсёды была галоўным атрыбутам хаты, сімвалам жыцця, жыватворным ачагом, які напаўняў сілай усіх дамачадцаў. Агонь у печы – сімвал сонца, назва якога ў беларускай народнай лексіцы гучала як “слонца”, таму і прыстасаванне для закрыцця печы называлі і называюць заслонка ці засланка.У народзе казалі, што “толькі тады хата гатова, калі зроблена печ”. “Ажыўленне” новай хаты суправаджалася перанясеннем агню з печы старога жылля. Продкі нашы ведалі шмат павер’яў і перасцярог, звязаных з печамі: калі хтосьці з дамачадцаў збіраўся ў дарогу, то печ закрывалі засланкай, нават калі ў ёй гарэў агонь, не дазвалялася нікому сядзець на печы, пакуль там выпякаўся хлеб. А якія смачныя з печы блінцы! Узгадаем Новую зямлю:

Дзень быў святы.Яшчэ ад рання
Блінцы пякліся на сняданне,
І ўжо пры печы з чапялою стаяла маці…

У нашай мясцовасці ёсць дзве пабудовы для абагрэву жылля і прыгатавання ежы – печ і печка. Адрозніваюцца яны



канструктыўна і памерамі. У наш час печы ўсё радзей сустракаюцца ў вясковых хатах, а вось печкі грэюць іх насельнікаў у халады. А як прыемна сабрацца на святочную вячэру ўсім разам каля печкі!

**Жылы пакой.** Чырвоны кут – галоўнае месца ў хаце. У старых сялянскіх хатах амаль заўсёды прасочваецца дыяганаль паміж печчу і чырвоным кутам. Правы бок ад гэтай дыяганалі лічыўся жаночай прасторай, левы – мужчынскай. На жаночым баку стаяў куфар. У ім змяшчалася святочная вопратка, посцілкі, рушнікі, прыданае, адным словам, самае каштоўнае, што было ў хаце. На мужчынскай палавіне мог быць розны інструмент і прыстасаванні, якімі мужчына карыстаўся, калі працаваў у хаце. Усю зіму пасярод жылога пакоя стаялі кросны ды калаўрот.



Звычайны вясковы дом,першапачаткова прызначаны для абароны чалавека ад непагадзі, паступова ператварыўся



ў своеасаблівы цэнтар сусвету, у якім галоўнымі сталі духоўныя каштоўнасці, ён стаў храмам для сям'і, месцам яго нараджэння і месцам яго смерці.

Калі ў вас з'явіцца магчымасць наведаць старэнькую хатку – абавязкова зрабіце гэта і вы пераканаецеся на свае вочы, як ўсё было дасканала і прадумана ў светапоглядзе і жыцці нашых продкаў.Сапраўдны космас, які адчуваеш не толькі ў вось такіх вандроўках, але і чытаючы Коласа, Мележа, Караткевіча.




Схема турыстычных
маршрутаў

| | |
|---|---|
| 1 | Знак-камень з датай першага ўзгадвання Маркава ў пісьмовых крыніцах |
| 2 | Помнік воінам-землякам ,якія загінулі падчас вайны |
| 3 | Памятны знак у гонар 600 годдзя Маркава і 155 годдзя царквы |
| 4 | Памятны знак аб падзеях Першай сусветнай вайны |
| 5 | Музейны пакой у Доме культуры |
| 6 | Царква Святой Жыраначальнай Троіцы |
| 7 | Дошка з тэкстам пісьма да Леніна на будынку сельвыканкама |
| 8 | Глінабітны дом |
| 9 | Глінабітны дом |
| 10 | Стары дом на вуліцы Кастрычніцкай |
| 11 | Стары дом на вуліцы Кастрычніцкай |
| 12 | Глінабітны дом |
| 13 | Дом парабка на вуліцы Паўночнай |
| 14 | Месца на якім стаяў млын |
| 15 | Дуб, які пасадзілі ў 1495 годзе |
| 16 | Вяз у вёсцы Верхнія Талуі |
| 17 | Лясны масіў Звярынец |
| 18 | “Рынычная плошча” |
| | Школа |